ведных ступенях кіравання працэсам педагагічнай карэкцыі развіцця дзяцей.

1. *Ариарский М.А.* Прикладная культуралогия. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб.: Издательство “ЭГО”, 2001.

2. *Запорожец А.В.* Избранные психологические труды: В 2 т. / Под ред. В.В.Давыдова, В.П.Зинченко. – М.: Педагогика, 1986. – Т. 1. – С. 54.

3. *Киселева Т.Г., Красильников Ю.Д.* Основы социально-культурной деятельности: Учеб. пособие. – М.: Моск. гос. ун-т культуры, 1995.

*С.У.Раманава*

## ЗНАЧЭННІ ЯК СПЕЦЫФІЧНЫ КУЛЬТУРНЫ СРОДАК СУВЯЗІ ЧАЛАВЕКА З СУСВЕТАМ І ГРАМАДСТВАМ

Значэнні – гэта спецыфічны культурны сродак сувязі чалавека з навакольным светам ці суб’екта з аб’ектам пры дапамозе знакаў. Да знакавых сістэм належаць натуральныя і штучныя моўныя сістэмы, розныя сістэмы сігналізацыі, мовы выяўленчых сістэм (вобразы, сімволіка). Уласцівасці знакавых сістэм вывучае семіялогія.

Сінонімам да тэрміна “значэнні” выступае тэрмін “сэнсы”. Але гэтыя тэрміны не цалкам сінанімічныя. Калі сэнс абазначае адносіны знака да свайго прадмета, яго сэнсавы змест, то значэнне раскрывае суадносіны культурных кампанентаў (нормаў, каштоўнасцей, ведаў) з іншымі сродкамі сацыяльнай рэгуляцыі.

Для культуралогіі важна раскрыць суадносіны сэнсавага зместу розных знакавых сістэм з сацыяльнымі працэсамі і спецыфікай культурнага асяроддзя.

Самі знакі не змяшчаюць інфармацыі, яны патрабуюць расшыфроўкі, гэта значыць давядзення да свядомасці чалавека, іх разумення. Чым абумоўлена неабходнасць для чалавека выпрацоўваць значэнні, абазначаць рэчы, уласныя ўчынкі і перажыванні?

Рэчы, дзеянні людзей, псіхалагічныя працэсы самі па сабе культуры не складаюць. Гэта толькі будаўнічы матэрыял для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яе. Але будучы азначаны, яны ўцягваюцца ў культуру, арганізуюцца ў сістэмы, уключаюцца ў функцыянаванне сацыяльных інстытутаў і ў жыццё пэўнай асобы. Культура надае значэнне важным, пераломным момантам чалавечага жыцця: нараджэнню, каханню, смерці, барацьбе, паражэнню, перамозе. Значэнні могуць належаць як да прыродных з'яў (размя- шчэнне зорак на небе, усход і захад), так і да ўнутранага стану чалавека.

Па-першае, значэнні дазваляюць чалавеку трымаць дыстанцыю ад уласных перажыванняў і назіраемых з'яў, а значыць, і выпрацоўваць асаблівыя формы дзейнасці. Да таго ж кожная з'ява ў прыродзе, грамадстве ці культуры валодае намнога большай колькасцю якасцей, чым тая, якая даступна непасрэднаму назіранню. Значэнні дазваляюць выпрацаваць значна больш дыферэнцыраваныя формы дзейнасці, суаднесеныя з аб'ектыўнымі ўласцівасцямі навакольнага свету. Яны даюць магчымасць мадэлявання з'яў, з якімі давядзецца мець справу, а самі паводзіны становяцца ўсё больш дыферэнцыраваным спосабам стаўлення чалавека да рэчаіснасці.

Па-другое, чалавек як істота сацыяльная павінен суадносіць свае інтарэсы з інтарэсамі іншых, а таксама з культурнымі патрабаваннямі. Менавіта праз сістэму значэнняў адбываецца такое суаднясенне.

Па-трэцяе, грамадства павінна замацоўваць свой вопыт у агульназначымых сімвалах, якія маглі б быць суаднесены адзін з адным, сістэматызаваны і перададзены наступным пакаленням.

Сродкамі культуры ствараюцца знакі, назвы, імёны, якія дазваляюць уявіць вобразы прадметаў, што адсутнічаюць, пералічыць і злучыць іх у любой паслядоўнасці. Нараджаецца шырокая сістэма значэнняў, з дапамогай якіх можна адрозніць адценні ў перажываннях ці з'явах бачнага свету. Абазначаючы і ацэньваючы з'явы, чалавек упарадкоўвае, тлумачыць, асэнсоўвае свет і сваё існаванне ў ім, атрымлівае магчымасць арыентавацца ў рэчаіснасці. Даць назву прадмету – значыць зрабіць першы крок на шляху яго разумення. Назва замацоўвае месца прадмета ў вопыце, дазваляе пазнаць яго.

Вядома, што значэнні слоў не заўсёды суадносяцца з са-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праўднымі якасцямі прадметаў, з’явамі ці працэсамі. Яны выпрацоўваюцца культурай праз узаемадзеянне чалавека з прыродай і фарміраванне прадметнага і сімвалічнага асяроддзя яго жяццядзейнасці. Значэнне можа мець рэальную крыніцу (сімвалізацыя грому, сонца, месяца, дрэва і інш.), але можа і не мець яе, а ўтвараць уяўляемую сутнасць у свеце культурных з’яў (багі, анёлы, русалкі і да т. п.), якія маюць значна большае значэнне, чым, здавалася б, самі аб’ектыўныя прадметы.

Важнейшым носьбітам сістэмы значэнняў з’яўляецца мова як найбольш універсальны сродак у параўнанні з іншымі знакавымі сістэмамі. Мова ў стане перадаць часавае вымярэнне (цяперашняе, мінулае, будучае), мадальнасць, асобу і інш.

Разам з тым вялікае значэнне ўжо на ранніх этапах культуры набываюць адзінкі вымярэння. Спачатку для гэтага выкарыстоўваліся натуральныя адзінкі – часткі цела (далонь, крок, ступня), прыродны час (дзень, суткі, год). Пазней адзінкі вымярэння запатрабавалі ўвядзення шматлікіх умоўных велічынь: лічбы, формулы, графікі, табліцы і інш.

Менавіта знакавыя функцыі пераважаюць у мастацкай культуры. Складаная мова архітэктуры, драмы, музыкі, танца, якая фарміруецца спалучэннем знаёмых элементаў, творча перапрацаваных, стварае асобную сферу культуры, праз якую чалавек спасцігае самыя складаныя формы сацыялізацыі. Абрады і рытуалы таксама маюць знакавае значэнне. Рытуал (вяселле, пахаванне, рэлігійныя святы) служыць мэтам умацавання сувязей ці паміж пастаяннымі членамі груп, ці ва ўзаемадзеянні паміж групамі, здымаючы напружанне, недавер і павышаючы ўзровень камунікатыўнасці, адчуванне агульнасці.

Самі па сабе значэнні могуць быць і нейтральнымі, бо вельмі шырокае патрэбнае грамадству кола абазначэнняў. Аднак, злучаючыся з нормамі і каштоўнасцямі, некаторыя з іх набываюць пэўны статус, які ўзвышае іх над іншымі, звычайнымі і паўсядзённымі. Яскравым прыкладам такога ўзвышэння служыць табу, гэта значыць катэгарычная знакавая забарона на вылучаныя прадметы, дзеянні і словы, парушэнне якой вядзе да суровага пакарання з боку калектыву.

Ва ўсіх культурах абавязковым сродкам выражэння зна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кавага зместу служаць не толькі спецыяльныя сімвалы, але і асяроддзе, якое афармляецца праз архітэктуру і ландшафт, а таксама прадметы бытавога карыстання, у тым ліку жыллё, адзенне, кухню і інш. Знакавы змест адлюстроўвае і знешні выгляд чалавека, уласцівыя яму рысы, яго генетычны, этнічны, узроставы выгляд. Вялікае знакавае значэнне належыць адзенню. Амаль усякае адзенне абазначае пэўнае сцвярджэнне самабытнасці – этнічнай, нацыянальнай, рэлігійнай. Разам з адзеннем знакавы змест маюць і чалавечае жыллё, мэбля, прадметы быту і інш.

Важнай культурнай адзнакай полу і ўзросту чалавека звычайна служаць такія натуральныя прыметы, як колер скуры, валасы, рысы твару, будова цела і інш. Але ва ўсялякай культуры гэтыя прыметы падпадаюць пад уздзеянне культурнай апрацоўкі. У большасці выпадкаў мужчыны павінны стрыгчы валасы ці насіць бараду. Жанчыны, як правіла, павінны рабіць прычоску, каб адпавядаць знакавым патрабаванням.

Важная сфера знакавай сацыялізацыі падрастаючага пакалення – гульні і цацкі. Цацкі выконваюць вялікую ролю ў самаідэнтыфікацыі падрастаючага пакалення і фарміраванні яго паводзін у сталым узросце. З малых гадоў дзіця ўсведамляе значэнні дарослага свету праз цацкі, наглядна ўспрымаючы тыя прадметы і адносіны вялікага свету, з якімі яму ў наступным давядзецца мець справы. Хлопчыкі звычайна асвойваюць значэнне салдацікаў, машын і іншых механізмаў, а дзяўчынкі гуляюць у лялькі. І тыя, і другія віды цацак рэагуюць на змяненні ў стылі эпохі і садзейнічаюць гэтаму змяненню. На змену нерухомым салдацікам прыходзяць робаты – трансформеры, а звычайная нерухомая, вялая лялька Каця саступае месца статнай Барбі.

Важным знакам, які выкарыстоўваецца ў многіх дзеяннях і зносінах, з'яўляюцца грошы. Прадметы, якія выкарыстоўваюцца ў якасці грошай, заўсёды звязаны з узроўнем развіцця грамадства і яго культурай. Пры гэтым адбываецца ўсё большая іх дэматэрыялізацыя (жывёла – каштоўныя металы – папяровыя сімвалы – электронныя грошы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Багдасарьян Н.Г.* Язык культуры // Культурология. – М., 1998.
2. *Гудков Л.* Культура повседневности в новейших социологических теориях: Обзорная информация. – М.,1988.
3. *Лосев А.Ф.* Знак, символ, миф. – М., 1982.
4. *Лотман Ю.М.* Избранные статьи. – Таллин, 1992. – Т. 1.
5. *Мантатов В.В.* Образ, знак, условность. – М., 1980.
6. *Петров М.К.* Человек и культура в научно-технической революции// Вопросы философии. – 1990. – № 5.
7. *Соколов Э.В.* Культура и личность. – М., 1972.
8. *Сорокин П.А.* Человек, цивилизация, общество. – М., 1991.
9. *Суханов И.В.* Обычаи, традиции и преемственность поколений. – М., 1976.
10. *Чернов Л.Ф.* Знаковость. – СПб., 1993.

*Н.Ф.Раманоўская*

## АКВАРЭЛЬ У ПРАФЕСІЙНАЙ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКА 1920–1930-х гг.

Прафесійная мастацкая адукацыя пачатку 1920-х гг. ставіла мэтай выхаваць і падрыхтаваць да самастойнай працы агітатараў, афарміцеляў святочных шэсцяў і мітынгаў, дэкаратараў, таму вучэбна-выхаваўчы працэс спалучаўся з выкананнем утылітарна-практычных заданняў. У такіх абставінах акварэль, не прэтэндуючы на самастойнасць, выконвала падначаленую ролю: выкарыстоўвалася ў нагляднай агітацыі, друкаванай графіцы, у эскізах да плакатаў. Практычныя заданні былі звязаны са стварэннем новага тыпу сучаснай кнігі, палітычнай карыкатуры.

Рэарганізацыя ў 1923 г. дзяржаўнага мастацка-практычнага інстытута ў Беларускі дзяржаўны мастацкі тэхнікум змяніла адносіны да акварэлі. Заняткі па акварэлі з’явіліся ў навучальных планах на пачатковым этапе вывучэння дысцыплін цыкла выяўленчага мастацтва. Праграмы навучання зацвярджаліся Галоўпрафадукацыяй і Інбелкультам. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ